УДК 94(476)»19»

# ЖЫРОВІЦКІ МАНАСТЫР ЯК ТУРЫСТЫЧНЫ АБ'ЕКТ МІЖВАЕННАГА ЧАСУ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВЫДАННЯ «W NOWOGRÓDZKIEJ STRONIE», 1935 г.)

**Булаты Павел Юр'евіч**
інстытут менеджменту спорту і турызму (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны аспектам пазіцыянавання значнага беларускага духоўнага цэнтра – Жыровіцкага манастыра як турыстычнага аб'екта ў міжваенны час. Аснова даследавання – матэрыялы інфармацыйна-турыстычнага бюлетэня «W Nowogródzkiej Stronie.*

У міжваенны час у Другой Рэчы Паспалітай значная ўвага надавалася развіццю разнастайных відаў унутранага турызму. Пры яго арганізацыі выкарыстоўвалюя шматлікія рэгіянальныя (у тым ліку і беларускія) турыстычныя рэсурсы. Развіццё турыстычнай справы падштурхоўвала і стварала магчымасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

для агульнага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Мясцовыя актывіюты імкнуліся знайсці ў сваім родным асяроддзі тое, што магло б прывабіць жыхароў усей краіны. Так фармаваўся рэгіянальны турыстычны прадукт.

Турыстычная дзейнасць ажыццяўлялася пры ваяводскіх урадах, таксама мелюя рэгіянальныя аддзелы дзяржаўных турыстычных аб'яднанняў. З 1935 г. пачаў актыўна дзейнічаць Саюз турыстычнай прапаганды Наваградскага краю (Związek Propagandy Turystycznej Ziemi Nowogródzkiej), які, акрамя арганізацыйнай дзейнасці, займаўся папулярызацыяй уласных славутых мясцін праз выдавецкую дзейнасць. Адным з папулярызатарскіх выданняў быў бюлетэнь «У Наваградскім краі» («W Nowogródzkiej Stronie»), прысвечаны рэгіянальнай турыстычнай дзейнасці.

Па тыпу выдання гэта інфармацыйна-турыстычны бюлетэнь. Яго рэдакцыя знаходзілася ў Наваградку (вул. Касцельная 3). Перыядычнасць выхаду – штомесяц, галоўны рэдактар – Алена Ляруй. Кошт асобнага нумару складаў 20 грошаў, рэалізоўваўся па падпісцы і адзінкава. Сёння вядома 7 нумароў выдання, якія выходзілі са студня па жнівень 1935 г. На яго старонках змяшчалюя матэрыялы, датычныя да разнастайнай турыстычнай тэматыкі.

Сярод шэрагу матэрыялаў, выяўлены матэрыял, прысвечаны адной з галоўных святынь Беларусі – Жыровіцкаму манастыру. Важна адзначыць, што ютотным выхаваўчым кампанентам ідэалагічнай польскай мадэлі 1930-х гг. з'яўлялася культурна-гістарычная спадчына. Праз яе адбор, дэманстрацыю, асаблівасці пазіцыянавання адбывалася пабудова агульных грамадскіх ідэйных арыенціраў. Найбольш простым спосабам дэманстрацыі культурна-гістарычнай спадчыны з'яўлялася яе выкарыстанне ў турызме. Як прадстаўляўся Жыровіцкі манастыр у сютэме культурнай спадчыны яскрава адлюстроўвае выяўлены артыкул у турыстычным выданні.

Матэрыял быў апублікаваны ў артыкуле «Помнікі Слонімшчны» [1]. Яго кантэнт пераважна ахоплівае гістарычную тэматыку, закранаецца сучаснасць (апюанне аб'ектаў, вартых увагі турыстаў). Гістарычная частка артыкула складаецца з наступных паслядоўных сюжэтаў.

*Цудадзейная ікона*. Знакамітая цудадзейная ікона Маці Божай Жыровіцкай з'яўлялася галоўным аб'ектам, які здаўна прыцягваў людзей да гэтай мясцовасці. Адзначалася, што «Жыровічы, дзякуючы цудадзейнаму абразу Божай Маці, былі залічаны да самых славутых месцаў Рэчы Паспалітай і лічыліся сталіцай літоўскай Багародзіцы нароўні з Чэнстаховай» [1, с. 4].

*Легенда аб з'яўленні абраза і з'яўленне манастыра*. Далей лаканічна прыводзіцца знакамітая легенда аб з'яўленні іконы пастушкам і акрэсліваецца роля А. Солтана ў з'яўленні манастыра. Адзначаецца, што росквіт манастыра звязаны з і. Мялешкам, які «пабудаваў тут прыгожую мураваную царкву і манастыр, куды запрасіў манаскі ордэн базыльянаў. Першым настаяцелем манастыра быў Святы Язафат Кунцэвіч» [1, с. 4].

*Пілігрымкі манархаў*. Сярод шматлікіх сюжэтаў з гісторыі манастыра ў артыкуле робіцца акцэнт на «каралеўскія пілігрымкі» – візітах у яго манархаў Рэчы Паспалітай. Таксама адзначаецца, што, акрамя манархаў, «ацаленні безнадзейна хворых і іншыя цуды ў Жыровічах прываблівалі да гэтага месца тысячы пабожных людзей» [1, с. 4].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Разбурэнні XVII ст.* Акцэнтуецца ўвага І на значных разбурэннях, якія былі ў манастыры ў перыяд вайны з Маскоўскай дзяржавай 1654–1664 гг. Адзначаецца, што «цяжкія часы перажывалі Жыровічы ў 1655-м і наступных гадах, калі былі занятыя маскоўскім войскам, якое знішчыла насельніцтва мястэчка І большую частку манахаў, выгнаўшы тых, хто застаўся» [1, с. 4]. Жыццё ў манастыр вярнулася толькі ў 1660 г. пасля бітвы пад Палонкай.

*Каранацыя іконы.* Досыць падрабязна ў матэрыяле апіюваюцца ўрачыстасці, якія праходзілі з 19 па 26 верасня 1730 г., звязаныя з каранацыяй іконы. Увага акцэнтуецца на вяльможных свецкіх і духоўных прысутных, колькасці пілігрымаў («прыступілі да Святога Прычасця ажно 140352 чалавекі» [1, с. 4].), адзначаецца іх геаграфічнае паходжанне (Мір, Мінск і Вільня, Наваградак). Адзначаецца, што Жыровіцкі абраз – «быў шосты каранаваны абраз у Польшчы [...] і ў час каранацыі базыльяне занатавалі сем цудадзейных выпадкаў» [1, с. 4].

*Ліквідацыя Царкоўнай уніі.* У гістарычным наратыве, прыведзенага ў артыкуле, падзеі скасавання Царкоўнай уніі падаюцца як пераломныя. Да ліквідацыі уніі, на думку аўтара, прывяло тое, што «базыльянаў з Жыровічаў выставіла свецкае ўніяцкае духавенства, якое ўсімі сіламі імкнулася да матэрыяльнага дабрабыту І ўлады [1, с. 4]», а таксама да ліквідацыі уніі «у значнай меры прычыніўся асцярожны Іосіф Сямашка [1, с. 4]». Як высонова – «разам з ліквідацыяй Уніі загінула даўняя слава Жыровічаў, ад якой сёння засталюя толькі ўспаміны [1, с. 4]».

У частцы артыкула, прысвечанай апіюанню архітэктурнай спадчыны, паведамляецца, што ў Жыровічах можна паглядзець касцёл пад тытулам Узвіжання Святога Крыжа (на той момант знаходзіўся пад уладай Каталіцкай царквы), які быў пабудаваны ў стылі ракако, комплекс мураваных манастырскіх будынкаў першай паловы XVIII ст., Успенскую царкву, якая цяпер праваслаўная. Адзначаецца, што пры будаўніцтве сабор быў у барочным стылі, які прасочваецца ў інтэр'ерах храма, знешне храм выкананы ў класічным стылі з элементамі візантыйскага стылю, каторыя з'явілюя ў XIX ст. Побач з саборам узносіцца званіца, пабудаваная ў другой палове XiX ст. ў класічным стылі. Таксама захавалюя тут дзве капліцы: адна мураваная ў стылі ракако (цяпер праваслаўная пад тытулам Святога Ануфрыя), І другая – драўляная, таксама праваслаўная, пабудаваная напачатку XIX ст. пад тытулам Святога Юрыя, дзе пахаваны Плацыд Янкоўскі [1, с. 4].

Такім чынам, разгледзеўшы матэрыял турыстычнай публіцыстыкі, прысвечаны Жыровіцкаму манастыру, можна адзначыць тры асноўныя матывы, якія прысутнічаюць у яго пазіцыянаванні:

1) Жыровічы – святое месца з цудадзейным абразом, якое на працягу многіх стагоддзяў было значным цэнтрам паломніцтва і культу Божай Маці («сталіца літоўскай Багародзіцы»);

2) Апеляцыя да даўняй гісторыі і ўключэнне Жыровіцкага манастыра ў гістарычны наратыў Польшчы як значнага месца памяці (манастыр быў пастаўлены ў адзін шэраг з галоўнай святыняй Польшчы, акцэнт на каралеўскіх пілігрымках, вялікая ўвага каранацыі іконы І акцэнт на ваенным спусташэнні);

3) Пазіцыянаванне тагачаснага праваслаўнага манастыра як былога ўніяцкага, акцэнт на яго мінулай канфесійнай прыналежнасці, магістральны тэзіс: лепшыя часы ў гісторыі манастыра – перыяд Царкоўнай уніі. У апіюанні архітэктурнай спадчыны таксама прасочваецца акцэнт на канфесійнай прына-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лежнасці сакральных аб'ектаў (праваслаўных, каталіцкіх, засяроджаная ўвага на былых грэка-каталіцкіх).

Можна абагульніць, што канцэпцыя пазіцыянаванне Жыровіцкага манастыра, як турыстычнага аб'екта, мае наступны канструкт: былая ўніяцкая святыня, якая мае духоўнае значэнне і вялікае значэнне ў гісторыі Польшчы.

## Літаратура


1. Larouy, H. Zabytki Słonimszczyzny / Helena Larouy («Hel.») // W Nowogródzkiej Stronie. – 1935. – № 2 (4). – С. 4–5.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова